## ГІСТАРЫЧНЫ ПОГЛЯД НА ЗАКАНАДАЎСТВА БЕЛАРУСІ АБ БАНКРУЦТВЕ

**В. С. Камянкоў**

Банкрут – неплацежаздольны даўжнік. Гэта эканамічна-прававая катэгорыя мае багатую гісторыю. У тым ліку ў Беларусі.

Вядома, што ў старажытным рымскім праве была прадугледжана магчымасць звяртання некалькіх спагнальнікаў да аднаго і таго ж даўжніка з патрабаваннем выплаты даўгоў. У выпадку нядольнасці даўжніка задаволіць патрабаванні крэдытораў ім было дазволена разсекчы яго цела на часткі і дзяліць паміж сабой. Што тычыцца складу маёмасці даўжніка, на якую маглі звярнуць спагнанне крэдыторы, рымляне адносілі да гэтай маёмасці, акрамя ўласна рэчаў, правы патрабавання даўжніка да трэціх асоб. Пры гэтым не ўключаліся ў конкурсную масу выдаткі на пахаванне самаго даўжніка і тых асоб, якіх ён абавязаны быў хаваць, а таксама даўгавыя патрабаванні, забяспечаныя закладам, або іпатэкай, якія падлягалі пераважнаму задавальненню перад усімі ўласнымі, нават прывілеяванымі патрабаваннямі крэдытораў. Гэта азначала, што па рымскаму праву патрабаванні іпатэчных крэдытораў маглі адхіліць конкурсных крэдытораў ад усялякага ўдзелу ў продажы маёмасці даўжніка.

Як і ў сучасным заканадаўстве многіх краін свету, старажытны рымскі закон пры задавальненні патрабаванняў крэдытораў перавагу аддаваў казне па нядоімках у падатках. Затым задавальняліся патрабаванні, якія вынікаюць з дагавораў з казной, а таксама законная іпатэка жонкі на ўсю маёмасць мужа ў забеспячэнне прыданага. Пасля задавальнення гэтых прывілеяваных патрабаванняў, задавальняліся ўсе іншыя патрабаванні, зыходзячы з часу ўстанаўлення закладу.

Цікавай асаблівасцю рымскага банкруцкага працэсу было тое, што крэдытор, які першым падаў хадайніцтва аб накладзе арышту на маёмасць даўжніка, не быў абавязаны вызываць іншых крэдытораў для ўдзелу ў справе аб банкруцтве. Такое становішча тлумачылася тым, што згодна з асноўным пачаткам рымскага права таго часу кожны вольны чалавек павінен клапаціцца толькі пра свае ўласныя інтарэсы, а не забяспечваць чужыя выгоды.

Гістарычныя карані айчыннага інстытута эканамічнай неплацежаздольнасці і банкруцтва ў Беларусі і Расіі сустракаюцца ўжо ў «Рускай праўдзе» (адным з першых рускіх заканадаўчых актаў, які дзейнічаў у

Старажытнай Русі ў XI–XII стст.). Заканадаўцам таго часу выдзяляюцца два віды банкруцтва:

– няшчаснае (невінаватае) банкруцтва, якое ўзнікла не па віне даўжніка (мела месца ў выпадку наступства рознага роду форс-мажорных абставін: пажару, наваднення, іншага стыхійнага бедства);

– зламыснае (вінаватае) банкруцтва, якое магло наступіць, напрыклад, у выпадку легкадумных паводзін купца (растрата давераных сродкаў, страта тавару ў выніку п'янства і іншых адмоўных дзеянняў).

Пазней у Банкруцкім статуце ад 19 снежня 1800 г. была зроблена спроба першага вопыту комплекснага прававога рэгулявання адносін па пытаннях банкруцтва.

Пад эканамічнай неплацежаздольнасцю разумелася такое маёмаснае становішча фізічнай або юрыдычнай асобы, пры якім апошняя была не ў стане задаволіць патрабаванні сваіх крэдытораў. Банкруцкі статут выдзяляў тры віды неплацёжаздольнасці:

– неплацежаздольнасць няшчасная, якая можа быць прызнана толькі пры наяўнасці непрадбачаных абставін, ніколькі не залежачых ад дзеянняў даўжніка (пажар, наваднене і г. д.);

– неплацежаздольнасць неасцярожная, але якая наступіла па віне самога даўжніка;

– неплацежаздольнасць злосная, ці інакш зламыснае банкруцтва (так, злосным банкрутам мог быць прызнаны ў тым ліку даўжнік, які прыйшоў да такога становішча па сваёй нявопытнасці, але пасля адкрыцця конкурснага вядзення прыняў спробы да сакрыцця часткі або ўсёй конкурснай масы) [10, с. 117].

У 1832 г. быў прыняты новы Статут аб неплацежаздольнасці, які ўвёў цэлы шэраг навел у параўнанні з дзеючым тады заканадаўствам.

Наступным этапам у развіцці інстытута неплацежаздольнасці (банкруцтва) было прынящце ў 1922 г. Грамадзянскага кодэкса РСФСР, у 1923 г. – Грамадзянскага кодэкса БССР і Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса РСФСР (у 1927 г. ў яго змест былі ўнесены адпаведныя главы, прызначаныя для рэгулявання пытанняў неплацежаздольнасці) [8, с. 40].

З 1930-х гг. ў Беларусі, як і ў Расіі, праваадносіны, звязаныя з эканамічнай неплацёжаздольнасцю прадпрыемстваў, практычна не рэгуляваліся. А ў пачатку 1960-х гг. нормы аб банкруцтве зусім былі выключаны з заканадаўства СССР. Інстытут банкруцтва афіцыйна не прызнаваўся, паколькі пры планавай сацыялістычнай эканоміцы, як сцвярджалася, не магло быць неплацежаздольнасці.

У сучасным заканадаўстве Рэспублікі Беларусь інстытут банкруцтва аднавіўся ў 1991 г. у Законе аб эканамічнай неплацёжаздольнасці і банкруцтве [7], і пазней – у Грамадзянскім кодэксе Рэспублікі Беларусь [1] (далей – ГК).

Да 1991 г. эканоміка Беларусі, як і іншых савецкіх рэспублік, будавалася на планавай аснове і жорсткім адміністрацыйным рэсурсе. Нацыянальнае заканадаўства не ведала нават такіх тэрмінаў, як «банкруцтва» або «неплацёжаздольнасць». Калі ўзнікала неабходнасць ліквідаваць або рэарганізаваць суб'ект гаспадарання, усе гэтыя працэсы праходзілі на аснове норм ГК пад кантролем дзяржавы, якая фактычна адначасова выступала і даўжніком, і крэдыторам.

У цэлым умоўна можна выдзеліць некалькі самастойных сучасных перыядаў у гісторыі развіцця беларускага заканадаўства аб банкруцтве. Трэба добра разумець, што банкруцтва ў той час не ўспрымалася ні грамадскасцю, ні юрыдычнымі асобамі і іх кіраўніцтвам, ні грамадзянамі.

***Першы перыяд.*** Пасля абвяшчэння ў 1990 г. незалежнасці і суверэнітэту ў нашай дзяржаве пачаліся эканамічныя і прававыя рэформы, накіраваныя на фарміраванне рыначнага механізму гаспадарання. У гэтай сувязі ў Рэспубліцы Беларусь быў падрыхтаваны і прыняты Вярхоўным Саветам (Парламентам) шэраг заканадаўчых актаў, якія рэгулююць новыя праваадносіны паміж суб'ектамі гаспадарання. У іх ліку Беларусь першай з усіх дзяржаў – удзельніц СНД (Садружнасці Незалежных Дзяржаў) 30 мая 1991 г. прыняла Закон «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці і банкруцтве».

На жаль, гэты першы перыяд больш нічым значным не выдзяляецца. Сам Закон «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці і банкруцтве» быў падрыхтаваны і прыняты ў такі час, калі аб рэальнай неплацежаздольнасці прадпрыемстваў па сапраўднаму яшчэ не думалі. Таму гэты Закон насіў у асноўным дэкларатыўны, спрошчаны характар. У ім былі абазначаны толькі некаторыя з праблем банкруцтва, але не было шляхоў іх вырашэння. Ён складаўся ўсяго з 46 артыкулаў.

Каб мець рэальнае ўяўленне аб Законе, дастаткова прывесці некаторыя з яго артыкулаў.

«Артыкул 6. Эканамічная неплацежаздольнасць – гэта засведчаная судом няздольнасць суб'екта гаспадарання аплаціць прад'яўленыя фінансавыя дакументы».

«Артыкул 7. Судаводства справы аб эканамічнай неплацежаздольнасці ажыццяўляецца з мэтай урэгулявання ўзаемаадносін суб'екта гаспадарання і крэдытораў, прадстаўлення права суб'екту гаспадарання прадоўжыць сваю дзейнасць».

«Артыкул 8. Падставай для ўзбуджэння вядзення справы аб эканамічнай неплацежаздольнасці з'яўляюцца:

няздольнасць суб'екта гаспадарання своечасова аплаціць прад'яўленыя фінансавыя дакументы;

перавышэнне вартасці даўгавых абавязацельстваў над вартасцю маёмасці суб'екта гаспадарання;

прызнанне суб'ектам гаспадарання сваёй эканамічнай неплацежаздольнасці» [7].

Як паказвае судовая статыстыка, ні крэдыторамі, ні ўласнікамі гэты Закон не выкарыстоўваўся ў яго сапраўдным сэнсе. У гаспадарчыя суды Рэспублікі Беларусь паступалі заявы асобных крэдытораў (як правіла, гэта былі камерцыйныя банкі) аб прызнанні эканамічна неплацежаздольнымі сваіх даўжнікоў (крэдытаатрымальнікаў) толькі з адной мэтай – прымусіць іх хутчэй аплаціць даўгі. І калі гэта ім удавалася, адразу паступала хадайніцтва ў суд абодвух бакоў аб спыненні вядзення справы.

***Другі перыяд.*** Вясной 1994 г. беларускі парламент прыняў новую Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, што стала добрым стымулам да развіцця якасна новых накірункаў, у тым ліку ў эканоміцы і ў праве. Ужо ў той час Міністэрствам эканомікі Рэспублікі Беларусь быў падрыхтаваны новы праект Закона аб банкруцтве. Да гэтай працы далучыўся і Вышэйшы Гаспадарчы Суд Рэспублікі Беларусь (Суд), які спачатку падтрымаў гэты праект. Пасля азнаямлення з канцэпцыямі заканадаўства аб банкруцтве шэрагу еўрапейскіх і іншых дзяржаў (Германіі, Францыі, Швецыі, Балгарыі, Літвы, Эстоніі, ЗША) Судом быў падрыхтаваны альтэрнатыўны варыянт праекта Закона «Аб банкруцтве». У гэтым жа годзе беларуская дэлегацыя прыняла ўдзел у міжнародным семінары па пытаннях банкруцтва, які праходзіў у г. Страсбургу пад эгідай Савета Еўропы. На гэтым семінары ўпершыню быў прадстаўлены на суд грамадскасці першы варыянт новага праекта Закона «Аб банкруцтве». Адначасова беларуская дэлегацыя азнаёмілася з рознымі канцэпцыямі заканадаўства аб неплацежаздольнасці, якія існавалі ў Еўропе, Азіі і ЗША, а таксама дэталёва вывучыла станоўчыя і адмоўныя бакі Канвенцыі аб банкруцтве.

З улікам атрыманага вопыту іншых дзяржаў альтэрнатыўны варыянт праекта Закона быў дапрацаваны, і ў студзені 1995 г. прадстаўлены Вышэйшым Гаспадарчым Судом Рэспублікі Беларусь у парадку заканадаўчай ініцыятывы ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь. Праект Закона быў уважліва разгледжаны ў камісіях Вярхоўнага Савета, адобраны і рэкамендаваны для разгляду на пленарным пасяджэнні сесіі Парламента. Аднак па розных прычынах ён так і не быў разгледжаны.

У тым жа 1995 г.:

– пры Вышэйшым Гаспадарчым Судзе Рэспублікі Беларусь на грамадскіх пачатках быў створаны Міжведамасны Савет па справах аб эканамічнай неплацежаздольнасці і банкруцтве, які стаў каардынатарам далейшых намаганняў па развіцці заканадаўства аб неплацежаздольнасці;

– праект Закона аб банкруцтве быў прадстаўлены для азнаямлення і магчымага ўнясення прапаноў розным дзяржаўным і недзяржаўным структурам Рэспублікі Беларусь (у тым ліку асобным прадпрыемствам);

– асноўныя распрацоўшчыкі праекта Закона атрымалі магчымасць дэталёва азнаёміцца з заканадаўствам аб банкруцтве ЗША і практыкай яго прымянення;

– праект Закона быў прадстаўлены на экспертызу ў амерыканскую асацыяцыю юрыстаў, з ім таксама азнаёміліся эксперты Сусветнага банка;

– былі праведзены семінары па пытаннях банкруцтва з удзелам спецыялістаў Расіі, Польшчы, ЗША;

– распрацаваны і прыняты наступныя нарматыўныя матэрыялы:

методыка па ацэнцы фінансавага становішча і вызначэнні крытэрыяў неплацежаздольнасці суб'ектаў гаспадарання;

Палажэнне аб дзяржаўным рэестры фінансавага становішча буйных і сярэдніх дзяржаўных прадпрыемстваў;

парадак адабрання невыкарыстоўваемай або неэфектыўна выкарыстоўваемай маёмасці, якая знаходзіцца ў рэспубліканскай уласнасці;

– пачата падрыхтоўка праектаў Законаў «Аб санацыі» і «Аб кіраўніку ў працэдуры банкруцтва».

Аб гэтай дзейнасці своечасова паведамлялася з унясеннем адпаведных прапаноў Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь і Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь.

У канцы 1995 г. быў абраны Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь новага склікання. У яго павестку дня былі ўключаны праекты законаў «Аб банкруцтве», «Аб санацыі», «Аб кіраўніку ў працэдуры банкруцтва».

Першы з іх па ініцыятыве Вярхоўнага Савета быў накіраваны на экспертызу ў Германскі фонд міжнароднага прававога супрацоўніцтва.

А далей было наступнае:

– у красавіку 1996 г. Урад прыняў пастанову, якой быў створаны Савет па банкруцтве і фінансавым аздараўленні суб'ектаў гаспадарання;

– у маі 1996 г. Вярхоўны Савет прыняў у першым чытанні законы «Аб банкруцтве (эканамічнай неплацежаздольнасці)», «Аб санацыі», «Аб кіраўніку ў працэдуры банкруцтва», распрацаваныя Вышэйшым Гаспадарчым Судом з удзелам вядучых спецыялістаў міністэрстваў і ведамстваў;

– у кастрычніку 1996 г. гэтыя тры праекты пасля дапрацоўкі ўнесеных прапаноў і заўваг былі прыняты Вярхоўным Саветам у другім чытанні і накіраваны на подпіс Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь;

– Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 лістапада 1996 г. [5] зацверджаны Асноўныя накірункі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 1996–2000 гг. У гэтай дзяржаўнай праграме прадугледжвалася:

⇒ стварыць прававое забеспячэнне ўсяго комлексу рыначных ператварэнняў, асабістых правоў і свабод грамадзян;

⇒ажыццяўляць паэтапную лібералізацыю ўсіх формаў эканамічнай дзейнасці, забяспечыць свабоду прадпрымальніцтва;

⇒здзейсніць адзіны і роўны падыход да ўсіх формаў уласнасці;

⇒стварыць канкурэнтнае асяроддзе і не дапускаць недобрасумленнай дзейнасці суб'ектаў гаспадарання на рынку;

⇒ператварыць сістэму дзяржаўнага рэгулявання сацыяльна-эканамічных працэсаў з пераводам яе на эканамічныя метады і зберажэнне прамога кіравання ў тых сферах, дзе рынкавая самарэгуляцыя неэфектыўна;

⇒правесці глыбокую рэструктурызацыю і камерцыялізацыю дзяржаўных прадпрыемстваў;

⇒стварыць рэальны механізм санацыі і банкруцтва (пры гэтым банкруцтва разглядалася як адна з формаў аздараўлення эканомікі);

⇒знізіць бюджэтныя расходы і зменшыць падатковы прэс.

***Трэці перыяд.*** Беларускае заканадаўства аб банкруцтве перажыло і некаторыя рэфарматарскія моманты. У лістападзе 1996 г. на рэферэндуме была прынята новая рэдакцыя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь [2]. Быў абраны двухпалатны Парламент, перагледжаны паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Парламента і Урада Рэспублікі Беларусь, судоў і некаторых іншых органаў. Праца над паляпшэннем заканадаўства аб банкруцтве працягвалася ў 1997 г. і ў наступныя гады. Было прынята рашэнне аб аб'яднанні праектаў трох законаў («Аб банкруцтве», «Аб санацыі», «Аб кіраўніку ў працэдуры банкруцтва») у адзіны праект Закона пад назвай «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве)».

Названы праект Закона быў распрацаваны ўжо з улікам новых (прынятых у 1998 г.) Грамадзянскага [1] і Гаспадарчага працэсуальнага [9] кодэксаў Рэспублікі Беларусь. У яго аснову пакладзены Мадэльны Закон СНД «Аб неплацежаздольнасці (банкруцтве)», які быў прыняты Міжпарламенцкай асамблеяй дзяржаў – удзельніц СНД 6 снежня 1997 г. [3].

Пры распрацоўцы гэтага Закона ўлічвалася таксама аналагічнае заканадаўства дзяржаў, якія маюць шматгадовы вопыт яго прымянення (Германіі, ЗША, Швецыі і інш.), а таксама судовая практыка гаспадарчых судоў Рэспублікі Беларусь. Але заканадаўства іншых краін у чыстым выглядзе выкарыстоўваць было немагчыма, паколькі ў практыцы яго прымянення праявіліся і негатыўныя моманты. У тым ліку і такія, як: крымінальны перадзел уласнасці; выкарыстанне механізма банкруцтва ў мэтах ліквідавання канкурэнта або ўстараненне яго з рынку; завалодванне чужымі матэрыяльнымі і фінансавымі сродкамі. Пры распрацоўцы айчыннага праекта Закона яго аўтары стараліся стварыць перашкоды такому «вопыту».

Праект новага Закона істотна адрозніваўся ад аналагічнага Закона 1991 г. І не толькі па аб'ёме (у ім было 260 артыкулаў замест 46 – у Законе 1991 г.), але і па сваёй канцэпцыі.

У аснову праекта былі пакладзены наступныя прынцыпы:

– наяўнасць судовай і пазасудовай працэдуры прызнання даўжніка банкрутам;

– прыярытэт санацыі (аздараўлення) і міравога пагаднення паміж конкурснымі крэдыторамі і даўжніком перад ліквідаваннем даўжніка;

– наяўнасць інстытута антыкрызісных кіраўнікоў на ўсіх стадыях судавядзення справы аб банкруцтве;

– сістэма гарантый ад злоўжывынняў з боку даўжніка, крэдытораў і кіраўнікоў у працэдуры банкруцтва пры распараджэнні маёмасцю даўжніка;

– дзяржаўныя гарантыі па сацыяльнай абароне працоўных правоў работнікаў даўжніка;

– дакладнае вызначэнне бакоў і іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у справе аб банкруцтве, іншых удзельнікаў працэса, іх правоў і абавязкаў;

– падробная рэгламентацыя ўсіх працэсуальных дзеянняў, якія ажыццяўляе гаспадарчы суд і другія ўдзельнікі працэса;

шырокая галоснасць судовага працэса па справе аб банкруцтве.

Дадзены праект Закона быў разгледжаны і прыняты Палатай прадстаўнікоў 22 чэрвеня 2000 г. і адобраны Саветам Рэспублікі 30 чэрвеня 2000 г. У ліпені 2000 г. Галавой дзяржавы быў падпісаны новы Закон Рэспублікі Беларусь «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве)». Ён уступіў у дзеянне праз шэсць месяцаў пасля яго афіцыйнага апублікавання [6].

Важнасць дадзенага Закона для аздараўлення эканомікі было цяжка перааацаніць. Па дадзеных Камітэта па санацыі і банкруцтве на 1 кастрычніка 1999 г. 46 % толькі дзяржаўных камерцыйных арганізацый рэспубліканскай формы ўласнасці з'яўляліся неплацежаздольнымі. У 4 % гэтых арганізацый становішча неплацежаздольнасці было крытычным, і адзінай магчымасцю разабраццa з іх запазычанасцю перад бюджэтам і іншымі крэдыторамі было правядзенне працэдур санацыі і банкруцтва.

Закон аб банкруцтве актыўна і эфектыўна выкарыстоўваўся на практыцы. Штогод гаспадарчымі судамі Беларусі разглядалася (і разглядаецца зараз) па адной тысячы спраў (і больш) аб банкруцтве. Але, як паказвае гісторыя прымянення заканадаўства аб банкруцтве ў іншых краінах, яно (заканадаўства) валодае вялікім дынамізмам і здольнасцю прыстасоўвацца да сітуацыі. Ва ўсякім выпадку, яго і вартасць, і недахопы дастаткова паспяхова выкарыстоўваюцца.

Вопыт прымянення Закона аб банкруцтве паказаў недасканаласць яго нормаў, магчымасць прымянення для негатыўных з'яў. Таму Вышэйшым Гаспадарчым Судом быў ініцыяваны праект Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 508 (далей – Указ № 508) [4].

Гэты заканадаўчы акт надаў шмат увагі пытанням папярэджвання банкруцтва, канкрэтызаваў паўнамоцтвы органаў выканаўчай улады ў

працэдуры банкруцтва, пашырыў змест дасудовага аздараўлення, упарадкаваў падставы для ўзбуджэння вядзення справы аб банкруцтве, прадугледзеў абмежаванні па ўзбуджэнні конкурснага і ліквідацыйнага вядзення для асобных катэгорый даўжнікоў, удакладніў паўнамоцтвы кіраўнікоў па справах аб банкруцтве, увёў шмат іншых навел.

Пры дзяржаўных органах створаны і дзейнічаюць камісіі па папярэджванні банкруцтва ў мэтах:

– распрацоўкі і ўнясення ў дзяржаўны орган прапаноў аб прыняцці мер па дасудовым аздараўленні (нараўне з асобамі, якія ў адпаведнасці з Указам № 508, іншымі актамі заканадаўства аб банкруцтве абавязаны прымаць меры па папярэджванні банкруцтва);

– падбору, арганізацыі падрыхтоўкі нароўні з органам дзяржаўнага кіравання па справах аб банкруцтве, а таксама акрэдытацыі асоб на ажыццяўленне дзейнасці часовага (антыкрызіснага) кіраўніка;

– падрыхтоўкі прапаноў па праектах міравых пагадненняў, планаў завяршэння дасудовага аздараўлення ў ахоўным перыядзе, планаў санацыі і планаў ліквідавання юрыдычных асоб, спынення дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў;

– правядзення аналізу эфектыўнасці дасудовага аздараўлення, выканання планаў санацыі і ліквідавання юрыдычных асоб, спынення дзейнасці індывідуальных прадпрымальнікаў і падрыхтоўкі прапаноў па выніках правядзення дадзенага аналізу.

Указ № 508 эфектыўна прымяняўся на практыцы, некалькі разоў змяняўся і дапаўняўся з мэтай удасканалення дасудовай і судовай працэдуры банкруцтва. Зараз створана камісія па падрыхтоўцы праекта новага Закона аб банкруцтве.

## Літаратура

1. Гражданский кодекс Республики Беларусь: Кодекс Республики Беларусь от 07.12.1998 № 218-З // Ведомости Национального Собрания Республики Беларусь. – 05.03.1999. – № 7–9. – Ст. 101.

2. Конституция Республики Беларусь от 15.03.1994 № 2875-XII (ред. от 24.11.1996) // Звязда. – 1996. – 27 ноября. – № 276.

3. Модельный закон о несостоятельности (банкротстве): принят на 10-ом пленарном заседании Межпарламентской Ассамблеи государств – участников СНГ в г. Санкт-Петербурге: постановление № 10-15 от 6 декабря 1997 г. // Информационный бюллетень Межпарламентской Ассамблеи государств – участников Содружества Независимых Государств. – 1998. – № 16. – С. 255–338.

4. О некоторых вопросах экономической несостоятельности (банкротства): Указ Президента Республики Беларусь от 12.11.2003 № 508 (ред. от 27.08.2004, с изм. от 13.06.2008) // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 19.11.2003. – № 127. – 1/5085.

5. Об утверждении Основных направлений социально-экономического развития Республики Беларусь на 1996–2000 годы: Указ Президента Республики Беларусь от 14.11.1996 № 464 // Собрание указов Президента и постановлений Кабинета Министров Республики Беларусь. –1996. – № 32. – Ст. 829.

6. Об экономической несостоятельности (банкротстве): Закон Республики Беларусь от 18.07.2000 № 423-З // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 11.08.2000. – № 73. – 2/198.

7. Об экономической несостоятельности и банкротстве: Закон Республики Беларусь от 30.05.1991 № 826-XII (ред. от 18.01.1994) // Ведомости Верховного Совета БССР. – 1991. – № 19. – Ст. 271.

8. *Степанов, В. В.* Несостоятельность (банкротство) в России, Франции, Англии, Германии / В. В. Степанов. – М.: Статут, 1999. – 204 с.

9. Хозяйственный процессуальный кодекс Республики Беларусь: Кодекс Республики Беларусь от 15.12.1998 № 219-З (вместе с «Порядком восстановления утраченного судебного или исполнительного производства») // Ведомости Национального собрания Республики Беларусь. – 1999. – № 13–14. – Ст. 195.

10. *Шершеневич, Г. Ф.* Конкурсное право / Г. Ф. Шершеневич. – 2-е изд. – Казань: Тип. Имп. ун-та, 1898. – С. 117.